**УЛАДЗІМІР ЛЯХОЎСКІ**

# Памяці Аляксандры Гесь



17 сакавіка не стала вядомай беларускай архівісткі ды гісторыка Аляксандры Гесь. У апошні час Аляксандра Мікалаеўна цяжка хварэла, жыла ў родных Гусаках, а ў сталіцу прыязджала толькі зрэдку. Так сталася, што, акрамя сваякоў, на пахаванне паспелі прыехаць усяго толькі некалькі яе даўніх знаёмых і сяброў.

Вестка пра смерць Аляксандры Мікалаеўны заспела мяне ў навуковай камандзіроўцы ў Познані. Са смерцю блізкага чалавека губляеш частку самога сябе, і ад такой страты горка і балюча. Але адначасова з гэтым успамінаецца ўсё тое незабыўна светлае, што звязвала нас на працягу амаль 17 гадоў сяброўства і творчай супрацы. Разам з нейкімі яркімі асабістымі ўражаннямі-ўспамінамі пра гэтага прыгожага і высакароднага чалавека хацелася б у першую чаргу адзначыць заслугі даследніцы ў галіне беларусістыкі, падсумаваць ейны ўнёсак у айчынную гістарычную навуку.

Нарадзілася Аляксандра Мікалаеўна Гесь 1 лютага 1940 г. у вёсцы Гусакі Нясвіжскага раёна, у сялянскай сям'і. Бацька, Мікалай Аляксандравіч, мабілізаваны ў 1944 г. у савецкае войска, загінуў увесну 1945 г. на тэрыторыі Польшчы, таму ўвесь цяжар вядзення гаспадаркі ды выхавання трох няпоўнагадовых дзяцей паклаўся на плечы маці, Дар'і Пятроўны.

---

**Уладзімер Ляхоўскі** — кандыдат гістарычных навук, дацэнт факультэту міжнародных адносінаў Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту. Ляўрэат прэміі Льва Сапегі (2010). У 2010 г. у выдавецтве «ARCHE» выйшла ягоная манаграфія «Школьная адукацыя ў Беларусі падчас нямецкай акупацыі (1915—1918)».

Пасля заканчэння Казлоўскай сямігодкі Аляксандра Гесь паступіла ў Нясвіжскую педагагічную вучэльню, дзе атрымала дыплом настаўніцы і была накіраваная на працу ў адну са школаў тагачаснага Давыд-Гарадоцкага раёна Пінскай вобласці. Варта адзначыць, што сярод вучняў А. Гесь быў будучы вядомы даследнік ваеннай гісторыі Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар Аляксей Літвін.

Адчуваючы патрэбу працягнуць адукацыю, Аляксандра Гесь у 1962 г. паступае на гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Яна шмат распавядала мне пра свае студэнцкія гады, даючы характарыстыку тагачасным выкладчыкам, якая часцяком адрознівалася ад звыклай для нас. Так, курсавыя і дыпломную працы яна пісала пад кіраўніцтвам сумнавядомага прафесара Лаўрэнція Абэцэдарскага, і яе ацэнка гэтага чалавека не зусім супадала з выказваннямі многіх іншых гадаванцаў гістфака БДУ і сучасных даследнікаў-гістарыёграфаў. Агульнавядома, што прафесар Абэцэдарскі спецыялізаваўся на вывучэнні беларуска-расійскіх дачыненняў XVI—XVIII стст., вельмі адыёзна і аднабакова асвятляючы гісторыю Беларусі. Ён нярэдка свядома фальсіфікаваў гістарычныя факты, адмаўляў нацыянальны пачатак у гісторыі беларускага народа, лічыў апошнюю неад’емнай часткай гісторыі Расіі. На думку А. Гесь, Лаўрэнцій Абэцэдарскі быў прадуктам свайго часу, які «бездакорна» выконваў загады кампартыі адносна ідэйнай накіраванасці беларускай гістарычнай навукі, але ягонае «масквафільства» не было зусім шчырым. Калі тэмаю для сваёй дыпломнай працы Гесь хацела ўзяць антысавецкую дзейнасць генерала Станіслава Булак-Балаховіча, то Абэцэдарскі яе адгаварыў ад гэтага кроку, парэкамендаваўшы ўзяць іншую, «больш простую тэму», сказаўшы ў прыватнай размове: «Не ўсё так проста з гэтым белым Чапаевым».

Пасля сканчэння БДУ ў 1967 г. Аляксандра Мікалаеўна працавала настаўніцаю гісторыі, а пасля — дырэктарам у школах Баранавіцкага і Ляхавіцкага раёнаў. У 1975 г. яна пераехала ў Мінск, дзе яе прынялі на працу ў Інстытут гісторыі партыі пры ЦК КПБ на пасаду навуковага супрацоўніка. Працаваць ёй выпала ў адным калектыве з вядомымі гісторыкамі — Іларыёнам Ігнаценкам, Міхаілам Касцюком, Якавам Паўлавым, Уладзімірам Міхнюком, Мікалаем Сташкевічам, Аляксеем Літвіным, Міхаілам Шумейкам, Аляксеем Каралём і інш.

Працуючы ў «гістпарце», Аляксандры Гесь давялося ўдзельнічаць у падрыхтоўцы розных дакументальных выданняў: «Хроника важнейших событий истории КПБ» (ч. 3, Мінск, 1980), «Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК» (т. 1—3, Мінск, 1983—1985), «Па волі народа: З гісторыі арганізацыі БССР і стварэння КПБ» (Мінск, 1988), «К. Калиновский: из печатного и рукописного наследия» (Мінск, 1988), «Идеологическая деятельность компартии Белоруссии» (ч. 1, Мінск, 1990). Мала хто нават з вядомых гісторыкаў «гістпартаўскай школы» згадае сёння пра тое, што выяўленне і збор дакументаў, датычных Кастуся Каліноўскага, у тагачасным Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архіве Літоўскай ССР у Вільні рабіла менавіта Аляксандра Мікалаеўна. Фотакопіі гэтых дакументаў дагэтуль захоўваюцца ў яе асабістым архіве. А пасля збору і выяўлення на яе плечы паклалася не менш сур’ёзная праца падрыхтоўкі самой кнігі для друку.

Збіраючы для партыйных выданняў матэрыялы з гісторыі КПБ, Аляксандра Гесь захапілася тэмаю беларусізацыі 1920-х гг. З 1970-х гг. яна стала шукаць у партыйным архіве дакументы, датычныя гэтай праблематыкі. Увогуле ж свядомай прыхільніцай беларушчыны яна стала яшчэ падчас навучання ў Нясвіжскай педагагічнай вучэльні, і беларуская мова заўсёды была для яе моваю штодзённага ўжытку, хоць у сценах «гістпарта» яна і мусіла карыстацца, як і ўсе астатнія, расейскай. Насуперак рэкамендацыям «гістпартаўскага» кіраўніцтва, Гесь адмыслова намагалася ўставіць у папярэднія «балванкі» рыхтаваных дакументальных зборнікаў па гісторыі КПБ дакументы, у якіх згадвалася палітыка беларусізацыі ды закраналіся пытанні аб пашырэнні ўжывання беларускай мовы ў грамадстве. Праўда, паводле яе ўспамінаў, тагачасны дырэктар «гістпарта» Расціслаў Платонаў звычайна своечасова выяўляў «крамолу» і праводзіў «прафілактычную працу» з празмерна ініцыятыўнаю супрацоўніцай.

Яна так і не абараніла кандыдацкай дысертацыі, без якой тады немагчыма было прабіцца ў навуковы свет. На Кірава, 45 (тагачасная сядзіба Інстытута партыі пры ЦК КПБ у Мінску) панаваў «навуковы патрыярхат» — жанчыне з заходнебеларускай вёскі без падтрымкі «зверху» зрабіць у названай установе навуковую кар’еру было надзвычай цяжка. Тым больш што паралельна даводзілася адной выхоўваць сына і даглядаць хворую маці. Аляксандра Мікалаеўна рэдагавала і вычытвала чужыя дысертацыі ды манаграфіі — калі на вусны загад начальства, а калі і з прыроднай дабрыні, саступаючы просьбам «таварышаў-калегаў», для многіх з якіх звяртанне да яе ў падобных справах рабіліся звычкаю. Навуковую ж вартасць многіх гэтых «опусаў» яна ведала не з чужых словаў.

Пасля 1991 г. адкрыліся «спецхраны» ў бібліятэках і архівах, на некаторы час знікла цэнзура і з’явілася магчымасць друкавацца. Для Аляксандры Гесь як для навукоўца гэта быў самы плённы перыяд жыцця. З восені 1991 г., пасля скону Савецкага Саюза і забароны КПСС, яна перайшла на працу ў Беларускі навукова-даследчы інстытут дакументазнаўства і архіўнай справы (БелНДІДАС), які ўзнік на абломках «гістпарту», а ў 1995 г. перавялася ў Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ) на пасаду вядучага навуковага супрацоўніка аддзела публікацыяў. У гэты час яна працягвае займацца грунтоўным вывучэннем нацыянальна-культурнага жыцця Беларусі ў 1920—1930-я гг., збірае і сістэматызуе дакументальныя крыніцы па гісторыі беларусізацыі 1920-х гг., даследуе лёсы «нацдэмаў» і нацыянал-камуністаў, рэпрэсаваных у сталінскі час, удзельнічае ў падрыхтоўцы дакументальных зборнікаў, што выходзілі пад грыфам БелНДІДАС і НАРБ. І самае галоўнае — пачынае актыўна друкавацца сама, асвятляючы ў сваіх артыкулах дзейнасць дзеячаў беларускага Адраджэння першай паловы XX ст.

Добра памятаю першую самастойную публікацыю А. Гесь, пасля выхаду якой мы з ёю і пазнаёміліся. Тагачасны начальнік Гесь, прафесар Уладзімір Міхнюк, даслоўна прымусіў яе нарэшце нешта з напрацаванага апублікаваць у перыядычным друку. Як вынік, у «Настаўніцкай газеце» 24 верасня 1994 г. з’явілася яе публікацыя пад гучнаю назвай «Беларускі універсітэт павінен быць беларускім». Разам з грунтоўнаю прадмоваю ў ёй была змешчаная дакладная запіска першага

і апошняга ў савецкі час беспартыйнага рэктара Белдзяржуніверсітэта Уладзіміра Пічэты на імя інспектара вышэйшых навучальных установаў БССР Лысава, датаваная лістападам 1928 г. Гэты дакумент выразна адлюстроўваў увесь напал супрацьстаяння Пічэты і ягоных прыхільнікаў з камуністычнай фракцыяй універсітэта на чале з прарэктарам Самуілам Слонімам у пытанні беларусізацыі БДУ. Бальшавіцкі асяродак ва ўніверсітэце імкнуўся тады пазбавіць Пічэту пасады рэктара і згарнуць усю працу свядомых беларусаў, якія імкнуліся замацаваць выкладанне ў гэтай вышэйшай школе беларусазнаўчых дысцыплінаў і перавесці ўсё навучанне на беларускую мову.

У 1997 г. разам з Уладзімірам Міхнюком і Мікалаем Клімовічам Аляксандра Гесь падрыхтавала выданне «Антон Луцкевич: Материалы следственного дела НКВД БССР» (Мінск, 1997). Гэтая кніга, што выйшла вельмі малым накладам, мела, аднак, вялікі рэзананс у грамадскіх колах. Згадаем і яшчэ некалькі толькі найбольш важных выданняў, ва ўкладанні якіх прыняла ўдзел Аляксандра Мікалаеўна:

Заложники вермахта (Озаричи лагерь смерти). Документы и материалы. Die Geiseln der Wehrmacht (Osaritschi — das Todeslager). Dokumente und Belege. — Минск, 1999;

Мікалай Шкялёнак. Беларусь і суседзі. Гістарычныя нарысы. — Беласток, 2003;

Язэп Лёсік. 1921—1930. Збор твораў. — Мінск, 2003;

1 января 1919 года: Временное рабоче-крестьянское советское правительство Белоруссии: документы и материалы. — Минск, 2005;

Слуцкі збройны чын 1920 г. у дакумэнтах і ўспамінах. — Менск, 2001; 2-е выд. — Менск, 2006.

Варта сказаць некалькі словаў пра апошнюю згаданую тут кнігу, якую мы рабілі з Аляксандраю Мікалаеўнаю разам. Зборнік не быў вынікам выканання нейкага планавага задання, проста галоўны рэдактар часопіса «Беларускі гістарычны агляд» Генадзь Сагановіч у свой час прапанаваў аўтару гэтага матэрыялу сабраць часовы творчы калектыў і за некалькі месяцаў падрыхтаваць на голым энтузіязме дакументальны зборнік, прысвечаны Слуцкаму паўстанню 1920 г. Працаваць са мною на такіх умовах пагадзілася толькі Аляксандра Мікалаеўна. Прафесар Уладзімір Міхнюк да канца не верыў, што з гэтага можа атрымацца хоць штосьці грунтоўнае. Маючы на руках дакументы з архіва КДБ Беларусі, якія тычыліся ўдзельнікаў слуцкіх падзеяў 1920 г., знайсці штосьці новае і важнае па гэтай тэме ў іншых крыніцах ён не спадзяваўся. Калі ж мы з А. Гесь праз пэўны час прынеслі яму больш за 150 старонак ужо набранага тэксту — арыгінальныя дакументы з беларускіх і польскіх архіваў і бібліятэк, матэрыялы з тагачасных перыядычных выданняў, а таксама рэдкія ілюстрацыі ды фатаграфіі, узрушаны Уладзімір Мікалаевіч адразу аддаў нам усё, што ў яго было сабрана па гэтай тэме. У выніку творчага супрацоўніцтва трох даследнікаў і архівістаў дакументальны зборнік па гісторыі Слуцкага збройнага чыну 1920 г. адбыўся, і кніга вытрымала ўжо два выданні. Шмат сілаў было аддадзена на стварэнне навуковага апарату да зборніка: заўвагаў, каментароў да змешчаных

дакументаў, удакладненняў біяграфічных звестак пра некалькі дзясяткаў малавядомых дзеячоў. Усё гэта ніколі не было б зроблена на такім узроўні, каб не ахвярная і напружаная праца Аляксандры Гесь.

Было і яшчэ некалькі важных навуковых праектаў, якія мы рэалізоўвалі разам з А. Гесь. Так, нельга не згадаць пра нашую сумесную працу над навуковым каталогам сумеснай беларуска-расійскай музейнай выставы «Ёсць на карце месца… Грамадска-культурная чыннасць беларускай і расійскай эміграцыі ў Чэхаславакіі, 1921—1938 гг.» (Мінск, 2002). Выстава мела вялікі поспех і ў Мінску (праходзіла з 27 мая да 3 ліпеня 2002 г.), і ў Маскве (з 24 студзеня да 14 лютага 2003 г.), анатацыя выяўленых пры яе падрыхтоўцы раней невядомых архіўных і музейных дакументаў з беларускіх і расійскіх архіваў, музеяў і бібліятэк была цалкам пададзеная ў згаданым каталогу. Для даследнікаў антысавецкай эміграцыі міжваеннага часу выданне стала добрым павадыром для глыбейшага даследавання праблемы.

Нельга абмінуць і таго ўнёску, які зрабіла Аляксандра Гесь для вывучэння творчай спадчыны Янкі Купалы. Менавіта яна рыхтавала тэксты і каментары да апошняга, 9-га тома поўнага збору твораў класіка нацыянальнай літаратуры.

Варта згадаць пра археаграфічныя даследаванні А. Гесь апошніх гадоў, якія тычыліся выяўлення і апісання новых дакументаў з беларускіх архіваў, датычных жыцця і дзейнасці Міхася Мялешкі ды Палуты Бадуновай[1]. Апошняе падрыхтаванае Аляксандрай Гесь археаграфічнае даследаванне тычылася апісання і выбарачнай публікацыі дакументаў з зусім яшчэ не апрацаванага фонда Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, у якім захоўваюцца матэрыялы эсэраўскага Беларускага рабочага клуба, які дзейнічаў у Мінску ў 1920—1923 гг.[2]

Акрамя ўсяго іншага, Аляксандра Гесь была таленавітым папулярызатарам нашай найноўшай гісторыі. Можна згадаць многія яе навукова-публіцыстычныя артыкулы, надрукаваныя ў розных выданнях, часцей за ўсё на старонках часопіса «Спадчына». Тэматычна гэта былі матэрыялы, якія тычыліся пытанняў правядзення беларусізацыі ў БССР у 1920-я гг., а таксама праблемы «ўзбуйнення» тэрыторыі рэспублікі коштам вяртання ёй раней адабраных Расіяй беларускіх этнічных тэрыторыяў на ўсходзе[3]. Адна з публікацыяў была прысвечана лёсу дарэвалюцыйных ашчадных грашовых укладаў беларусаў, рэквізаваных савецкаю ўладаю. Тут жа апавядаецца гісторыя былога эмігранта з Беларусі Алеся

[1] Гл.: Бібліятэка Міхася Мялешкі: Зводны каталог / Склад.: В. У. Скалабан і інш.; навук. і бібліяграф. рэд. Т. І. Рошчына. — Мінск, 1998; Гесь А. М., Калеснік Н. Я. Як трапілі ў архіў дакументы Палуты Бадуновай // Архіварыус. Зборнік навукова-папулярных паведамленняў і артыкулаў. Вып. 5. Мінск, 2000. С. 14—20; Гесь А. М. Міхась Мялешка вяртаецца на Беларусь. Новыя дакументы // Тамсама. С. 46—51.

[2] Гесь А. М. Беларускі рабочы клуб // Архіварыус. Зборнік навукова-папулярных паведамленняў і артыкулаў. Вып. 6. Мінск, 2001. С. 45—59.

[3] Гл.: Як адстойвалі ўсходнія землі / Прадм. і публікац. А. Гесь // Спадчына. 1995. № 6. С. 37—54; Гесь А. Калінінская акруга: хроніка беларускага культурнага жыцця 1920-х гг. // Спадчына. 2001. № 3. С. 3—49.

Кутаса, у якога савецкія мытнікі экспрапрыявалі на мяжы ў 1921 г. 1,5 тысячы амерыканскіх долараў, якія наш суайчыннік крывёю і потам зарабіў за некалькі гадоў, працуючы ў ЗША[4].

Вельмі арыгінальнаю і вясёлаю (праўда, як кажуць, са слязьмі на вачох) аказалася падрыхтаваная А. Гесь серыйная падборка «перлаў» з архіўных збораў і ўспамінаў пра савецкую рэчаіснасць 1920—1930-х гг., аб'яднаных рубрыкаю «Быў час, была эпоха...», якія друкаваліся на старонках «Спадчыны» пачынаючы з № 2 за 2003 г. Чытачу прапаноўваліся падборкі арыгінальных матэрыялаў, якія давалі магчымасць зірнуць на нядаўняе савецкае мінулае крыху нетрадыцыйна: з іроніяй, сарказмам і гумарам. Гэтыя зацемкі ды дакументы, «вырваныя» з архіўных справаў і друкаваных выданняў, наўрад ці мелі самадастатковую каштоўнасць, а вось у «калекцыі» яны ззялі, як вясёлка.

Напісанае застаецца, і зробленае Аляксандрай Мікалаеўнай Гесь надалей працуе на будучыню Беларусі. Хоць самой яе не стала, але навукова-даследчая праца, распачатая ёю, не спынілася. Яшчэ пабачаць свет тыя выданні, у падрыхтоўцы якіх яна брала чынны ўдзел. Неўзабаве выйдзе ў серыі «Нашы славутыя землякі» яе кніжка «Беларускі лірнік», прысвечаная жыццю і творчасці выдатнага беларускага кампазітара і хормайстра Уладзіміра Тэраўскага. Абавязкова пабачыць свет і асобны том архіўных дакументаў, успамінаў ды іншых матэрыялаў, прысвечаных іншаму слыннаму беларускаму кампазітару і музыканту Мікалаю Равенскаму. Мы будзем помніць Вас, Аляксандра Мікалаеўна, і будзем згадваць пра тое, што вы здзейснілі дзеля беларускай культуры і навукі. Верым, як і Вы, што Беларусь будзе жыць!

[4] Бяз права на ўласнасьць / Прадм. і публікац. А. Гесь і У. Ляхоўскага // Спадчына. 2000. № 5—6. С. 59—75.